(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.0

ДАМБРОЎСКАЯ
Наталля Мікалаеўна

# ТВОРЧАСЦЬ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА Ў ЛІТАРАТУРНЫМ ПРАЦЭСЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ: ЖАНРАВА-СТЫЛЁВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2010

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна"

Навуковы кіраўнік — **Мішчанчук Мікалай Іванавіч,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры беларускага
літаратуразнаўства УА "Брэсцкі
дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна",
член-карэспандэнт БелАА

Афіцыйныя апаненты: — **Штэйнер Іван Фёдаравіч,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры беларускай літаратуры
УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя
Ф. Скарыны"

**Грамадчанка Таіса Канстанцінаўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры
УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка"

Апаніруючая арганізацыя — УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя
Янкі Купалы"

Абарона адбудзецца 5 сакавіка 2010 года ў 14.30 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "4" лютага 2010 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Хмяльніцкі М.М.

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

На сённяшні дзень у айчынным літаратуразнаўстве даволі грунтоўна вывучана творчасць класікаў нацыянальнага слоўнага мастацтва першай паловы XX стагоддзя, у меншай ступені даследаваны творчыя набыткі літаратараў – прадстаўнікоў "філалагічнага пакалення". Не ў поўным аб'ёме вывучана і творчасць пісьменніка-"шасцідзесятніка" **Вячаслава Адамчыка (1933–2001)**, якая ўяўляе сабой цэласную, рухомую мастацкую сістэму, заснаваную на прынцыпах творчага выкарыстання аўтарам разнастайных прыёмаў пісьма, у многім абумоўленых працэсам актыўнага родава-жанравага і стылёвага ўзаемадзеяння.

Аб'ектам даследавання літаратуразнаўцаў былі тэтралогія (раманы "Чужая бацькаўшчына", "Год нулявы", "І скажа той, хто народзіцца", "Голас крыві брата твайго") і апавяданні В. Адамчыка канца 1950-х – пачатку 1970-х гадоў (зборнікі "Свой чалавек", "Млечны шлях", "Міг бліскавіцы", "Дзікі голуб"). Як правіла, асноўную ўвагу літаратуразнаўцы засяроджвалі на станаўленні творчай індывідуальнасці пісьменніка, на аналізе яго раманаў у ідэйна-тэматычным і праблемным планах, на характарыстыцы вобразаў галоўных герояў, на асаблівасцях сюжэтаскладання. Творчасць В. Адамчыка канца 1950 – 1980-х гадоў была і ёсць прадметам даследавання С. Андраюка, П. Дзюбайлы, М. Тычыны, Р. Шкрабы, А. Яскевіча і іншых аўтараў. У 1990-я – 2000-ы гады з'явіліся новыя творы В. Адамчыка, што склалі кнігі "Яблык спакусы" (1995), "Развітальная аповесць" (1999), "Нязрушаны камень" (2002) і да гэтага часу не сталі прадметам грунтоўнага навуковага даследавання. Сталую сувязь творчасці пісьменніка пераважна ў галіне буйных эпічных жанраў з творчасцю класікаў не толькі айчыннай (К. Чорны, М. Гарэцкі, Я. Колас, І. Мележ), але і сусветнай (Ф. Дастаеўскі, Л. Талстой, У. Рэймант, Г. Флабэр) літаратур раскрывалі ў сваіх працах В. Генаш, В. Каваленка, Я. Лецка, Н. Суддзева, А. Халянкова, Ю. Шчука. Аднак па-за ўвагай літаратуразнаўцаў да гэтага часу застаецца праблема жанрава-стылёвай эвалюцыі творчасці пісьменніка ў кантэксце дасягненняў прадстаўнікоў яго пакалення.

Такім чынам, актуальнасць вывучэння эвалюцыі творчасці В. Адамчыка абумоўлена наступнымі фактарамі:

– неабходнасцю вывучэння жанрава-стылёвага ўзаемадзеяння ў беларускай літаратуры, якое адбывалася асабліва актыўна ў другой палове XX стагоддзя ва ўмовах эвалюцыі слоўнага мастацтва (рэалістычнага ў аснове) да змястоўнай і фармальнай свабоды;

– адсутнасцю ў беларускім літаратуразнаўстве даследаванняў, прысвечаных вывучэнню эвалюцыі творчасці В. Адамчыка ад апісальнасці і лірызму да

жанрава-стылёвай разнастайнасці, сінтэтызму; падобнае даследаванне тым больш неабходнае з улікам абавязковага вывучэння творчасці пісьменніка, уключанай у вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь[1];

– неабходнасцю стварэння больш шырокай і аб'ектыўнай карціны літаратурнага працэсу другой паловы XX стагоддзя, адметнасць якога ў значнай ступені абумоўлена імкненнем развітых літаратур свету (у ліку якіх і беларуская) да далейшага авалодвання на больш высокім узроўні прынцыпамі пісьма на этапе актыўных пошукаў новага зместу і новых форм яго раскрыцця.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з планавай навуковай тэмай кафедры беларускага літаратуразнаўства УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна" "Гісторыка-эстэтычныя заканамернасці і жанрава-стылёвыя асаблівасці беларускага літаратурнага працэсу XX – пачатку XXI стагоддзяў" і дзяржбюджэтнай тэмай "Беларуская і руская літаратуры канца XIX – першай трэці XX стагоддзяў: традыцыйнае, наватарскае, кантэкст" (тэма № 16, № дзяржрэгістрацыі 20061832).

### Мэта і задачы даследавання

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – выявіць і раскрыць жанрава-стылёвую эвалюцыю творчасці Вячаслава Адамчыка ў кантэксце дасягненняў ідэйна блізкіх яму беларускіх і рускіх пісьменнікаў.

У адпаведнасці з акрэсленай мэтай ставяцца і вырашаюцца наступныя **задачы**:

– аналізам фактычнага матэрыялу пацвердзіць канцэпцыю жанрава-стылёвай рухомасці як адной з вызначальных рыс літаратурнага працэсу другой паловы XX стагоддзя;
– вызначыць ролю аўтабіяграфізму ў станаўленні прозы В. Адамчыка і блізкіх яму па стылі беларускіх і рускіх пісьменнікаў;
– раскрыць працэс фарміравання псіхалагізаванага стылю В. Адамчыка;
– высветліць значэнне медытатыўнасці і філасафічнасці ў станаўленні і эвалюцыі індывідуальнага стылю і жанравай сістэмы пісьменніка;

[1] Беларуская літаратура. V-XI класы: вучэб. праграма для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання: зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Нац. ін-т адук., 2009. – 128 с. ; Гісторыя беларускай літаратуры: тып. вучэб. праграма для выш. навуч. устаноў па спец.: 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць; 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 04 - 01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура); 1-02 03 05 Беларуская мова і літаратура. Журналістыка; 1-02 03 07 Замежная мова (з указаннем мовы). Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 07 - 01 Замежная мова (з указаннем мовы). Беларуская мова і літаратура): зацв. Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.І. Жуком (10 лютага 2009 г., рэг. № ТД-А 158/тып.). – Мінск, 2008. – 53 с.

– ахарактарызаваць сінтэтычны стыль В. Адамчыка як вынік яго дасягненняў на заключным этапе творчасці; пацвердзіць тэарэтычныя назіранні і вывады прыёмамі статыстычнага аналізу.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляюцца творы В. Адамчыка, М. Стральцова, І. Пташнікава, Я. Брыля, У. Караткевіча, В. Карамазава, В. Бергольц, У. Салаухіна, **прадметам** –жанрава-стылёвая эвалюцыя творчасці В. Адамчыка ў кантэксце дасягненняў блізкіх яму па стылі беларускіх і рускіх пісьменнікаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Літаратура другой паловы XX стагоддзя пад уплывам грамадскіх падзей і ў сувязі з неабходнасцю замены нарматыўнага (у межах сацыялістычнага рэалізму) пісьма больш свабодным паглыбляла і пашырала тэматычны дыяпазон, пераадольвала родава-жанравую і стылёвую зададзенасць. Гэтыя тэндэнцыі адбіліся і на творчасці В. Адамчыка і ідэйна блізкіх яму беларускіх (М. Стральцоў, І. Пташнікаў) і рускіх (В. Бергольц, У. Салаухін) пісьменнікаў, дапамаглі ёй стаць больш шматграннай і дасканалай. У абсягах перамен, што адбываліся ў слоўным мастацтве названага перыяду, развівалася лірычная проза (у 1950 – 1960-я гады – у рамантычна-ўзнёслым, у 1980 – 1990-я гады – у лірыка-аналітычным і алегорыка-сімвалічным варыянтах) – вынік працэсу ўзаемаўплыву эпічнага і лірычнага родаў літаратуры.

2. Аўтабіяграфізм у значнай ступені спрыяў лірызацыі прозы В. Адамчыка і блізкіх яму па стылі пісьменнікаў, дапамагаў ім выразней самараскрывацца ў творах рознай формы, злучаць традыцыйную ў эпічным родзе апавядальнасць са спавядальнасцю, паядноўваць у мастацкіх творах аб'ект-суб'ектныя адносіны з суб'ект-суб'ектнымі, актарыяльны і аўктарыяльны аповедныя тыпы.

3. Стыль В. Адамчыка развіваўся ад падзейнага апісання, вонкавага паказу персанажаў, адлюстравання спрошчаных канфліктаў да паглыблення ва ўнутраны свет герояў, псіхолага-аналітычнай матываванасці іх паводзін. Мастацкі стыль В. Адамчыка характарызуецца значнай колькасцю прыёмаў (псіхалагічны аналіз, дыялектыка душы, мастацкая дэталь, сон персанажа, яго партрэт, рэтраспекцыя, рэтардацыя і інш.) і форм (прамая, ускосная, сумарна-вызначальная) раскрыцця псіхалагічнага стану персанажаў.

4. Творам В. Адамчыка канца 1950-х – пачатку 1960-х гадоў было характэрна ілюстрацыйнае, прадметна-выяўленчае адлюстраванне рэчаіснасці, але паступова ў апавяданнях узмацняліся адзнакі медытатыўнасці і філасафічнасці, што выклікала актыўнае ўзаемадзеянне прыёмаў лірычнага, эпічнага і драматычнага пісьма, стылёвыя змены, абнаўленне традыцыйных жанраў і з'яўленне новых жанравых мадыфікацый. Пошукі В. Адамчыка ў

канцы 1960-х – 2000-м гадах палягаюць у рэчышчы набыткаў лірыка-медытатыўнай, філасофска-аналітычнай прозы XX стагоддзя і маюць шмат агульнага з набыткамі У. Караткевіча, Я. Брыля, М. Стральцова, У. Салаухіна, В. Бергольц.

5. Эмацыянальна-экспрэсіўная "афарбоўка" апавяданняў В. Адамчыка эвалюцыянуе ад успрымання аўтарам жыцця як гармоніі да прызнання яго супярэчлівасці і драматызму. Гэты фактар абумоўлівае не толькі актыўнае жанрава-стылёвае, але і міжродавае ўзаемадзеянне ў творчасці В. Адамчыка. Проза беларускага пісьменніка ў позні перыяд творчасці (1987–2000) вызначаецца шматграннасцю і сінтэтызмам, пошукам разнастайных жанрава-стылёвых утварэнняў.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя ў поўным аб'ёме выканана самастойна. Аўтарам дысертацыі выяўлена і раскрыта жанрава-стылёвая эвалюцыя творчасці В. Адамчыка ў кантэксце дасягненняў ідэйна блізкіх яму беларускіх (М. Стральцоў, І. Пташнікаў) і рускіх (У. Салаухін, В. Бергольц) пісьменнікаў, прасочана развіццё дамінантных рыс індывідуальнага стылю, ахарактарызаваны паэтапныя змены ў жанравай сістэме мастака слова. Вынікамі статыстычнага аналізу пацверджана дынаміка эмацыянальна-ацэначнай "афарбоўкі" апавяданняў В. Адамчыка, актыўнае родава-жанравае і стылёвае ўзаемадзеянне ў творчасці пісьменніка. У такім ракурсе творчасць В. Адамчыка даследавана ўпершыню.

Артыкулы, у якіх апублікаваны вынікі дысертацыі, напісаны без сааўтараў.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі былі прадстаўлены на 12 рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях: 1) V межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных (Брест, 29-30 мая 2003г.); 2) Международная научная конференция "Наследие Л.Н. Толстого и современность" (175 лет со дня рождения) (Витебск, 13-14 ноября 2003 г.); 3) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасны стан, перспектывы" (Брэст, 18-19 снежня 2003 г.); 4) Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуска-польска-украінскае філалагічнае памежжа: гісторыя, сучасны стан, будучыня" (Брэст, 27-28 красавіка 2004 г.); 5) VII межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных, посвящённая 60-летию университета (Брест, 20 мая 2005 г.); 6) VIII Республиканская межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных (Брест, 19 мая 2006 г.); 7) Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі сучаснай філалогіі"

(Брэст, 3 лістапада 2006 г.); 8) Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя “Куляшоўскія чытанні” (Магілёў, 26-27 красавіка 2007 г.); 9) VIII Міжнародныя Купалаўскія чытанні (Мінск, 26-27 чэрвеня 2007 г.); 10) VI Калеснікаўскія чытанні (Брэст, 26 кастрычніка 2007 г.); 11) Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні (Да 100-годдзя выхаду зборніка “Жалейка”) (Гродна, 11-12 красавіка 2008 г.); 12) IV Міжнародная навуковая канферэнцыя “Скарына і наш час” (Гомель, 13-14 лістапада 2008 г.).

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь: 1) УА “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”, 2) ДУА “Брэсцкі абласны інстытут развіцця адукацыі”, 3) ДУА “Гімназія № 1 г. Брэста”, 4) УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы”, 5) УА “Маларытская дзяржаўная раённая агульнаадукацыйная гімназія № 1”, 6) УА “Маларытская дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа № 2”. Па выніках укаранення аформлена 6 актаў аб практычным выкарыстанні матэрыялаў даследавання.

**Апублікаванасць вынікаў**

Асноўныя матэрыялы даследавання адлюстраваны ў 17 публікацыях: 5 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (3,4 аўтарскага аркуша), 2 артыкулы ў навуковых зборніках (у тым ліку 1 – у замежным друку) (0,9 аўтарскага аркуша), 10 матэрыялаў выступленняў на навуковых канферэнцыях (2,4 аўтарскага аркуша). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 6,7 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі, дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі – 207 старонак. Асноўны тэкст дысертацыі складае 109 старонак, дадаткі (22) – 79 старонак. Бібліяграфічны спіс уключае 295 назваў і складае 19 старонак.

Разгляд творчасці В. Адамчыка і блізкіх яму па стылі пісьменнікаў у святле праблемы жанрава-стылёвай эвалюцыі дазваляе зрабіць наступныя вывады.

Жанрава-стылёвая, пафасная, ідэйна-тэматычная карціна літаратурнага працэсу другой паловы XX стагоддзя была даволі складанай, дынамічна-зменлівай, залежнай ад многіх аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, што пацвярджаецца ў працы цэласным аналізам твораў В. Адамчыка і ідэйна блізкіх яму беларускіх (М. Стральцоў, І. Пташнікаў, Я. Брыль, У. Караткевіч) і рускіх (В. Бергольц, У. Салаухін) пісьменнікаў. В. Адамчык з'яўляецца прыхільнікам лірыка-медытатыўнага, псіхолага-аналітычнага, філасофскага, "паглыбленага" пісьма, пра што сведчаць вынікі статыстычнага аналізу.

У творчасці В. Адамчыка намі была выяўлена дынаміка эмацыянальна-ацэначнай "афарбоўкі" апавяданняў (жыццярадасная ў 1950 – 1960-я і трагічна-драматычная ў 1990-я – 2000-ы гады), іх змястоўнасці (аптымізм – расчараванне – зняверанасць), вобразнасці (рамантызаваны малюнак, гарманічная карціна – псіхалагізаваная карціна – сінтэз малюнкавасці, прадметных рэалій і медытатыўных разважанняў, філасофскіх сентэнцый), жанрава-стылёвай сістэмы (нарысы, лірычныя апавяданні, лірычныя мініяцюры, імпрэсіі, поўныя светлых эмоцый, а пазней – творы-медытацыі, апавяданні-споведзі, аналітычныя эсэ, навелы, поўныя элегічна-сумнага, трагедыйнага настрою). Гэтыя зрухі дэтэрмінаваны аб'ектыўнымі (кардынальныя змены ў эстэтычнай праграме пісьменнікаў-"шасцідзесятнікаў" пад уплывам грамадскіх падзей, распад іх ранейшай мастацкай сістэмы) і суб'ектыўнымі (смерць бацькоў пісьменніка, яго ўласная хвароба, унутраная адзінота, якую ён часта перажываў) фактарамі. Комплексны аналіз апавяданняў В. Адамчыка дае магчымасць зрабіць выснову пра сінтэтычны характар творчасці пісьменніка ў цэлым.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Літаратура другой паловы XX стагоддзя адчула на сабе ўплыў грамадскіх перамен і ўвасобіла іх у мастацкую практыку. Асабліва актыўную ролю ў пашырэнні і паглыбленні ўплыву новых абставін на станаўленне гуманістычных, агульначалавечых ідэалаў адыгралі В. Адамчык, М. Стральцоў, І. Пташнікаў, У. Караткевіч, В. Бергольц, У. Салаухін і іншыя пісьменнікі. Яны пераадольвалі ідэйна-тэматычную абмежаванасць, стандартнасць вобразнага мыслення, родава-жанравую і стылёвую зададзенасць мастацтва слова. Пад уплывам лёсавызначальных зменаў, што адбываліся ў жыцці краіны ў канцы 50-х – 60-я і ў 80 – 90-я гады XX стагоддзя і – адпаведна – у мастацкай

творчасці, эвалюцыянаваў такі феномен, як лірычная проза, якая засведчыла актыўнае ўзаемадзеянне эпасу і лірыкі. Гэтая даўняя тэндэнцыя актывізавалася ў нашаніўскі перыяд і 1920-я гады і асабліва выразна заявіла пра сябе ў другой палове XX стагоддзя, стаўшы спрыяльнай глебай для рэалізацыі спачатку рамантычнага настрою ў суб'ектывізаваных мастацкіх формах і экспрэсіўна-эмацыйным і філасофска-разважлівым стылях, а пасля (асабліва ў канцы 1980-х гадоў) настрою расчаравання і зняверанасці ў адпаведных яму жанравых мадыфікацыях і разнастайных індывідуальных стылях [1; 13; 14].

2. Значны ўплыў на станаўленне прозы В. Адамчыка аказаў аўтабіяграфізм. Убачанае і ўласна перажытае, асабліва ў дзяцінстве, у значнай ступені спрыяла лірызацыі прозы В. Адамчыка і блізкіх яму па стылі беларускіх (М. Стральцоў, І. Пташнікаў, У. Караткевіч, І. Навуменка, Я. Брыль, В. Карамазаў, В. Казько, Б. Сачанка) і рускіх (В. Бергольц, У. Салаухін, В. Астаф'еў) пісьменнікаў, дапамагала ім праецыраваць мінулае на сучаснасць, выразней самараскрывацца ў творах рознай формы, злучаць традыцыйную ў эпічным родзе апавядальнасць са спавядальнасцю, паядноўваць у мастацкіх творах аб'ект-суб'ектныя адносіны з суб'ект-суб'ектнымі, актарыяльны і аўктарыяльны аповедныя тыпы [2; 7; 8].

3. Мастацкі стыль В. Адамчыка эвалюцыянаваў ад знешнепадзейнага апісання, схематызму (апавяданні "На крыжавых дарогах", "Свой чалавек", "Зоня", "Млечны шлях", "За перагародкай", "Міг бліскавіцы") да скрупулёзнага даследавання чалавечых характараў, глыбокага спасціжэння ўнутранага свету персанажа, дэталёвага ўзнаўлення і падрабязнага аналізу стану яго душы і матывіровак учынкаў ("Пагарэльцы", "Кароль Нябожа", "Нязрушаны камень", "Ноч на Галавасека", "Сон у калядную ноч", "Развітальная аповесць", многія эпізоды тэтралогіі). Для твораў пісьменніка канца 1960-х – 2000-га гадоў характэрна лірыка-псіхалагічнае, псіхолага-аналітычнае ўзнаўленне стану душы персанажа. Стыль празаіка характарызуецца значнай колькасцю прыёмаў (псіхалагічны аналіз, дыялектыка душы, мастацкая дэталь, сон персанажа, яго партрэт, рэтардацыя і інш.) і форм (прамая, ускосная, сумарна-вызначальная) раскрыцця псіхалагічнага стану герояў твораў як малых, так і буйных жанраў. Глыбокі псіхалагізм дасягаецца В. Адамчыкам і дзякуючы частаму ўжыванню гістарычных экскурсаў і спалучэнню маналогаў персанажа, аўтара і аўтара-персанажа [3; 9; 11; 12; 15; 17].

4. Мастацкае перастварэнне рэчаіснасці адбывалася ў ранніх апавяданнях В. Адамчыка ў ілюстрацыйным, апісальным (прадметна-выяўленчым) ракурсе. На пачатку 1960-х гадоў з'явіліся творы з адзнакамі медытатыўнасці і філасафічнасці, што выклікала замену бытавых і сацыяльна-бытавых апавяданняў на лірыка-медытатыўныя, філасофска-аналітычныя

апавяданні, эсэ і інш. У прозе пісьменніка ў сярэдні і позні перыяды творчасці непасрэднае адлюстраванне жыцця арганічна спалучаецца з лірыка-медытатыўным, філасофска-аналітычным спасціжэннем рэчаіснасці (тэтралогія, "Развітальная аповесць", апавяданні "Дзікі голуб", "Кароль Нябожа", "Аптэка нумар тры", "Сцежка на расходніку", "Нязрушаны камень" і інш.), што збліжае набыткі гэтага пісьменніка з набыткамі Я. Брыля, У. Караткевіча, М. Стральцова, У. Салаухіна, В. Бергольц. Пра паступовае ўзмацненне, паглыбленне ў творчасці В. Адамчыка медытатыўнага і філасофскага пачаткаў сведчыць і тэндэнцыя маналагізацыі прозы пісьменніка [4; 5; 7; 10; 15; 16].

5. Статыстычны падлік ужытых В. Адамчыкам у апавяданнях слоўна-выяўленчых сродкаў з розным эмацыянальна-экспрэсіўным адценнем выявіў эвалюцыю творчасці пісьменніка ад успрымання жыцця як цэласнай гармоніі (ранні перыяд) да прызнання яго складанасці і трагізму (позні перыяд творчасці). Вынікі статыстычнага аналізу выкарыстаных В. Адамчыкам дыялогаў, разнапланавых маналогаў, пейзажных замалёвак, гістарычных экскурсаў засведчылі агульную эвалюцыю ад апісальнасці, прадметнай выяўленчасці да лірыка-псіхалагічнага, псіхолага-аналітычнага пісьма, што пацвярджае канцэпцыю актыўнага родава-жанравага і стылёвага ўзаемадзеяння ў творчасці празаіка. Кампазіцыйным ядром у большасці твораў В. Адамчыка становіцца асоба аўтара ці героя, увага акцэнтуецца на іх душэўным стане, на перадачы асабістага, суб'ектыўнага погляду на свет. Статыстычныя дадзеныя ў цэлым пацвярджаюць нашы назіранні і галоўную выснову пра сінтэтычнасць стылю пісьменніка (асабліва ў позні перыяд). Пра актыўнае ўзаемадзеянне адзнак эпічнага, лірыка-медытатыўнага, дыдактычна-павучальнага, сатырычнага, дакументальнага, фантастычнага, сімволіка-алегарычнага, філасофска-аналітычнага пісьма асабліва сведчыць аповесць "Падарожжа на Буцафале" (1991). Для творчасці В. Адамчыка ў цэлым характэрны разнастайныя жанравыя і стылёвыя мадыфікацыі [5; 6; 7; 15; 17].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні спецыфікі беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя, вывучэнні тыпалагічных сувязей беларускай і рускай літаратур; пры распрацоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецкурсаў, спецсемінараў па «Тэорыі літаратуры», «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя», пры напісанні курсавых і дыпломных прац, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК**

1. Дамброўская, Н.М. Ля вытокаў лірычнай прозы / Н.М. Дамброўская // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. – 2007. – № 1 (7). – С. 32–39.

2. Дамброўская, Н.М. Малая проза Вячаслава Адамчыка: жанравая і стылявая адметнасць, кантэкст / Н.М. Дамброўская // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. – 2008. – № 1 (9). – С. 25–33.

3. Дамброўская, Н.М. Проза Вячаслава Адамчыка: пачатак станаўлення / Н.М. Дамброўская // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2008. – № 3 (49). – С. 75–79.

4. Дамброўская, Н.М. Раман Вячаслава Адамчыка "Чужая бацькаўшчына": праблематыка, вобразы, майстэрства / Н.М. Дамброўская // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 11. – С. 47–53.

5. Дамброўская, Н.М. Медытатыўнасць і філасафічнасць як стылявыя адзнакі прозы Вячаслава Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Весн. Гродзен. ун-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2009. – № 1 (78). – С. 8–13.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

6. Дамброўская, Н.М. Праблема нацыянальнага адраджэння і мастацкія прыёмы яе вырашэння ў аповесцях "Лабірынты" Вацлава Ластоўскага і "Падарожжа на Буцафале" Вячаслава Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Сб. науч. тр. / Uniwersytet w Białymstoku. Wydział Filologiczny, Instytut Filologii Wschodniosłowiańskiej. – Białystok, 2007. – Tom 7 : Studia Wschodniosłowiańskie. – S. 205–216.

7. Дамброўская, Н.М. Лірычная проза Вячаслава Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У.І. Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 2009. – С. 273–277.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

8. Дамброўская, Н.М. Вячаслаў Адамчык – майстар лірычнай прозы / Н.М. Дамброўская // V межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных : сб. материалов, Брест, 29–30 мая 2003 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. А.А. Горбацкого. – Брест, 2003. – Ч. 2. – С. 149.

9. Дамброўская, Н.М. Вобраз прыроднага (натуральнага) чалавека ў творчасці Л.М. Талстога і В. Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Наследие Л.Н. Толстого и современность (175 лет со дня рождения) : материалы науч. конф., Витебск, 13–14 нояб. 2003 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.А. Нестеренко [и др.]. – Витебск, 2003. – С. 101–103.

10. Дамброўская, Н.М. Тэма “Чалавек і зямля” ў беларускай і рускай літаратурах: пастаноўка праблемы / Н.М. Дамброўская // Руска-беларускае літаратурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучасны стан, перспектывы : матэрыялы міжнар. навук. канф., Брэст, 18–19 снеж. 2003 г. : у 2 ч. / Брэсц. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. М.І. Мішчанчука. – Брэст, 2004. – Ч. 1. – С. 60–65.

11. Дамброўская, Н.М. Мастацкае адлюстраванне тэмы нацыянальнага самазахавання і адраджэння ў тэтралогіі Вячаслава Адамчыка (сюжэтная лінія Міці Корсака) / Н.М. Дамброўская // Беларуска-польска-украінскае філалагічнае памежжа: гісторыя, сучасны стан, будучыня : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 27–28 крас. 2004 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; пад рэд. З.П. Мельнікавай [і інш.]. – Брэст, 2004. – С. 48–51.

12. Дамброўская, Н.М. Асаблівасці аўтарскай пазіцыі Вячаслава Адамчыка ў раскрыцці тэмы “Чалавек на вайне” / Н.М. Дамброўская // VII межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных, посвящённая 60-летию университета : сб. материалов, Брест, 20 мая 2005 г. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. А.А. Горбацкого. – Брест, 2005. – С. 162–164.

13. Дамброўская, Н.М. Працэс лірызацыі мастацкай прозы як адна з асноўных тэндэнцый развіцця беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / Н.М. Дамброўская // VIII республиканская межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных : сб. материалов, Брест, 19 мая 2006 г. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. Б.М. Лепешко. – Брест, 2006. – С. 94–96.

14. Дамброўская, Н.М. Некаторыя тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага працэсу: да праблемы родава-жанравай дыфузіі / Н.М. Дамброўская // Куляшоўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 26–27 крас. 2007 г. / Магіл. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В.І. Рагаўцоў [і інш.]. – Магілёў, 2007. – С. 36–38.

15. Дамброўская, Н.М. Асаблівасці стылю прозы Вячаслава Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі сучаснай філалогіі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 70-годдзю з дня нарадж. вучонага-літаратуразнаўцы, педагога, прафесара Аляксея Антонавіча Майсейчыка, Брэст, 3 ліст. 2006 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. З.П. Мельнікавай. – Брэст, 2008. – С. 16–21.

16. Дамброўская, Н.М. Проза В. Адамчыка і М. Стральцова: родава-жанравае і ідэйна-тэматычнае падабенства / Н.М. Дамброўская // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы рэсп. навук. канф., прысвеч. 85-годдзю з дня нарадж. У.А. Калесніка, Брэст, 26 кастр. 2007 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; пад агул. рэд. З.П. Мельнікавай, Г.М. Праневіча. – Брэст, 2008. – С. 53–56.

17. Дамброўская, Н.М. Псіхалагізм як мастацкі прынцып творчасці Вячаслава Адамчыка / Н.М. Дамброўская // Скарына і наш час : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Гомель, 13–14 ліст. 2008 г. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т, Навук.-дасл. ін-т гіст. і культ. усходнеслав. народаў пры ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2008. – Ч. 2. – С. 164–168.

# РЭЗЮМЭ

## Дамброўская Наталля Мікалаеўна

## Творчасць Вячаслава Адамчыка ў літаратурным працэсе другой паловы XX стагоддзя: жанрава-стылёвая эвалюцыя

***Ключавыя словы:*** эвалюцыя творчасці, родава-жанравая дынаміка, лірычная проза, жанрава-стылёвае ўзаемадзеянне, аўтабіяграфізм, суб'ектыўнасць аповеду, псіхалагізм, медытатыўнасць, філасафічнасць.

***Мэта даследавання*** – выявіць і раскрыць жанрава-стылёвую эвалюцыю творчасці Вячаслава Адамчыка ў кантэксце дасягненняў ідэйна блізкіх яму беларускіх і рускіх пісьменнікаў.

***Метадалогія даследавання.*** Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся асноўныя прынцыпы гісторыка-функцыянальнага, кампаратывісцкага, біяграфічнага метадаў вядзення літаратуразнаўчых даследаванняў, а таксама прыёмы статыстычнага аналізу.

Упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве выяўлена і раскрыта жанрава-стылёвая эвалюцыя творчасці В. Адамчыка ў кантэксце дасягненняў ідэйна блізкіх яму беларускіх (М. Стральцоў, І. Пташнікаў) і рускіх (У. Салаухін, В. Бергольц) пісьменнікаў. Прасочана абумоўленая як аб'ектыўнымі, так і суб'ектыўнымі фактарамі эвалюцыя прозы В. Адамчыка ад апісальнага да лірыка-медытатыўнага, псіхолага-аналітычнага і – як вынік – сінтэтычнага пісьма. Выяўлена развіццё вызначальных рыс індывідуальнага стылю, ахарактарызаваны паэтапныя змены ў жанравай сістэме пісьменніка. Вынікамі статыстычнага аналізу пацверджана дынаміка эмацыянальна-ацэначнай "афарбоўкі" апавяданняў В. Адамчыка, актыўнае родава-жанравае і стылёвае ўзаемадзеянне ў творчасці пісьменніка. Падобны прыём даследавання творчасці В. Адамчыка выкарыстаны ў айчынным літаратуразнаўстве ўпершыню.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшым даследаванні спецыфікі беларускага літаратурнага працэсу XX стагоддзя, вывучэнні тыпалагічных сувязей беларускай і рускай літаратур; пры распрацоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецкурсаў, спецсемінараў па «Тэорыі літаратуры», «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя», пры напісанні курсавых і дыпломных прац, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

# РЕЗЮМЕ

**Домбровская Наталья Николаевна**

**Творчество Вячеслава Адамчика в литературном процессе второй половины XX столетия: жанрово-стилевая эволюция**

***Ключевые слова:*** эволюция творчества, родово-жанровая динамика, лирическая проза, жанрово-стилевое взаимодействие, автобиографизм, субъективность изложения, психологизм, медитативность, философичность.

***Цель исследования*** – выявить и раскрыть жанрово-стилевую эволюцию творчества Вячеслава Адамчика в контексте достижений идейно близких ему белорусских и русских писателей.

***Методология исследования.*** Для решения поставленных задач использовались основные принципы историко-функционального, компаративистского, биографического методов ведения литературоведческих исследований, а также приёмы статистического анализа.

Впервые в белорусском литературоведении выявлена и раскрыта жанрово-стилевая эволюция творчества В. Адамчика в контексте достижений идейно близких ему белорусских (М. Стрельцов, И. Пташников) и русских (В. Солоухин, О. Берггольц) писателей. Прослежена обусловленная как объективными, так и субъективными факторами эволюция прозы В. Адамчика от описательного к лирико-медитативному, психолого-аналитическому и – как результат – синтетическому письму. Выявлено развитие доминантных черт индивидуального стиля, охарактеризованы поэтапные изменения в жанровой системе писателя. Результатами статистического анализа подтверждена динамика эмоционально-оценочной "окраски" рассказов В. Адамчика, активное родово-жанровое и стилевое взаимодействие в творчестве писателя. Подобный приём исследования творчества В. Адамчика использован в отечественном литературоведении впервые.

Основные положения и выводы диссертации могут быть использованы при дальнейшем исследовании специфики белорусского литературного процесса XX столетия, изучении типологических связей белорусской и русской литератур; при разработке лекций и практических занятий, спецкурсов, спецсеминаров по "Теории литературы", "Истории белорусской литературы XX столетия", при написании курсовых и дипломных работ, учебно-методических пособий и учебников для средних и высших учебных заведений Республики Беларусь.

## SUMMARY

**Dombrovskaya Natalia Nickolaevna**

### The Works of Viacheslav Adamchic in Literary Process in the Second Half of the XX Century: Genre-Styled Evolution

***Key words:*** evolution of literary work, sort-genre dynamics, lyrical prose, genre-styled interaction, autobiography, subjectiveness of narration, psychologies, meditation, philosophy.

***The aim of the research*** – to reveal the genre-styled evolution of Viacheslav Adamchik's literary works in the context of works of Byelorussian and Russian writers.

***The methodological basis of the research.*** To decide research tasks the main principles of functional historic, comparative, biographic methods, method of statistic analysis are used.

For the first time in Belarusian literary studies genre-styled evolution of the works of Viacheslav Adamchik in the context of the achievements of Byelorussian (M. Streltsov, I. Ptashnicov) and Russian (O. Berggolts, V. Solouhin) writers is revealed. The development of literary talent of V. Adamchic from descriptive to lyrical-meditative, psychology-analytical and synthetic style is shown and determined by objective and subjective factors. The development of the main features of V. Adamchik's style is traced, changes of writer's genre system are characterized. The dynamics of emotional organization of V. Adamchik's stories, sort-genre and style interaction in writer's works are proved by the results of statistic analysis. This method of investigation of V. Adamchik's prose is realized in Belarusian literary studies for the first time.

Main theses and results of the dissertation may be used for further investigation of specific of Belarusian literary process in the XX century, for study of typological links of Byelorussian and Russian literature; for preparation of lectures and practical classes, specialized courses, seminars in "Theory of Literature", "The History of Belarusian Literature of XX Century", while writing course and degree works, methodological textbooks in the system of secondary and higher education in the Republic of Belarus.